*Лясныя манахі.*
*[Адкуль чорныя буслы]*











*Гавораць, некалі яны таксама жылі побач з людзьмі - майстравалі сваё жытло на страсе хаты або хлява і кожную раніцу вясёлым клёкатам будзілі вясковых пастушкоў. Радаваліся такому суседству і дзеці, і старыя... А людзі кожную вясну сустракалі іх з далёкага выраю, як самых дарагіх і блізкіх.*

*Але, кажуць, у вёсцы аднойчы пасяліўся злы, нядобры чалавек. Яму было ўсё не так, усё не гэтак. Не мог цярпець ён і буслінага клёкату. Каб не чуць яго, палез на страху, паскідаў буслянят, а гняздо разбурыў.*

*Доўга кружылі ў той дзень птушкі над непрыветнай хатай. Потым паляцелі ў лясныя нетры, дзе не было ні вёскі, ні людзей, і заначавалі на высозным дубе. Калі ўзышло сонца, птушак было не пазнаць. Ад крыўды і несправядлівасці яны ажно пачарнелі.*

*Потым на тым дубе яны пабудавалі сабе новае гняздо.*
*А пазней у іх з'явіліся і бусляняты. Надзвычай даверлівыя і бялюткія... Але калі падраслі і даведаліся ад бацькоў пра тую вялікую крыўду, таксама апранулі жалобна адзенне... Так і паляцелі яны, чорнымі, у далёкі вырай.*

*А вясною вярнуліся.*

*Толькі не ў вёску, а ў пушчу...*

*І хоць таго нядобрага чалавека даўно няма на свеце, птушкі ніяк не могуць забыцца пра сваю крыўду і кожны год стараной аблятаюць людскія паселішчы...*

*Праўда, іншы раз чорны бусел світанкам прылятае на нёманскі плёс, заходзіць па калені ў цёплую ваду і з тугою паглядае на стрэхі хат.*